ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (839) ● Чацвер, 24 лютага 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV



Нядаўна наш універсітэт наведала група аспірантаў з сацыялістычных краін, якія вучацца ў Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК КПСС.

**На здымку:** госці БДУ на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

Фота **Д. Чаховіча.**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ГІСТФАК

● Гісторыкі правялі сходы, на якіх падведзены вынікі II этапу Ленінскага заліку. Сацабавязацельствы выкананы амаль усімі курсамі. У параўнанні з мінулым годам значна палепшылася паспяховасць. Так, першы курс здаў сесію без нездавальняючых адзнак.

● У воінаў падшэфнай часці пабывала факультэцкая агітбрыгада. Студэнты сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прачыталі лекцыі, выступілі з канцэртам, у якім прымаў удзел эстрадны аркестр факультэта.

● У штабе працоўных спраў зараз гарачая пара. Зацвярджаюцца спіскі будаўнічых атрадаў і кандыдатуры камандзіраў і камісараў. З пяці камандзіраў тры—члены КПСС, кожны выязджаў з атрадам па два-тры разы.

● Закончыўся факультэцкі этап конкурсу на лепшага дэкламатара, прысвечаны 50-годдзю утварэння СССР. Пераможцы ўзнагароджаны граматамі.

● Вынікі лекцыйнай работы ў час зімовых канікул паказалі, што кожны другі студэнт прачытаў лекцыю ці даклад. Зараз пры ленінскіх пакоях у домакіраўніцтвах працуюць восем шэфскіх атрадаў, створаных на факультэце. Іх задача — лекцыйная прапаганда сярод насельніцтва.

ФІЗФАК

● Свята Савецкай Арміі на фізічным факультэце пачалося ужо даўно чытаннем лекцый на ваенна-патрыятычныя тэмы. А нядаўна на II курсе першага і другога патокаў удзельнік Курскай бітвы У. Д. Мухаеў расказаў пра баі за Курск.

● У камітэце камсамола фізікаў па панядзелках — збор сакратароў патокаў. На гэты раз ішло абмеркаванне ходу II этапу Ленінскага заліку.

● Партбюро заслухала інтэрсектар камітэта камсамола, які ў апошні час амаль перастаў працаваць. Былі прааналізаваны прычыны дрэннай работы, зроблены прапановы.

● «КП» камітэта камсамола і спецыяльная камісія па быту штотыднёва робяць рэйд у інтэрнат. Вынікі падводзяцца ў выпусках «Камсамольскага пражэктара». Справа пастаўлена такім чынам, што за парушэнне правіл студэнтам пагражае высяленне.

ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА.

## ПЛЁН НАВУКОВАЙ АДДАНАСЦІ

Звычайна віншаванні юбілярам не абыходзяцца без шчырых слоў павагі, удзячнасці і нават любві, сардэчных, ад глыбіні душы пажаданняў новых творчых поспехаў, моцнага здароўя аж да ста гадоў.

На гэты раз сяброўскія віншаванні былі адрасаваны загадчыку кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання дацэнту журфака Міхаілу Яўгенавічу Цікоцкаму, якому споўнілася 50 год. У гонар юбіляра сабраўся вучоны савет факультэта, на які прыйшлі не толькі выкладчыкі і супрацоўнікі, а і шматлікія студэнты, госці.

Дэкан факультэта журналістыкі, доктар гістарычных навук Р. В. Булацкі расказаў пра гады ваеннай маладосці і навуковы шлях былога студэнта БДУ, затым аспіранта, а сёння вядомага вучонага.

Госць з Кіеўскага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі прафесар У. А. Рубан, сябры М. Я. Цікоцкага і яго вучні-студэнты гаварылі пра плённую навуковую працу, прынцыповасць і цудоўныя чалавечыя якасці юбіляра.

У адрасе, які быў уручан Міхаілу Яўгенавічу, гаворыцца:

*«Дарагі Міхаіл Яўгенавіч!*

*У дзень 50-гадовага юбілею мы шчыра віншуем Вас, свайго калегу, таварыша і сябра. Да гэтага віншавання далучаюцца выпускнікі факультэта і студэнты, уся шматлікая армія беларускіх журналістаў.*

*Плён Вашай працы — у цудоўных, глыбокіх лекцыях. Плён Вашай навуковай думкі — у Вашых друкаваных кніжках і доктарскай дысертацыі. Плён Вашай чалавечнасці — у сяброўстве і добразычлівасці. Вы шмат здзейснілі на сваім жыццёвым шляху: з гонарам выканалі доўг салдата сваёй бацькаўшчыны і з гонарам неслі і несяцё высокае званне савецкага вучонага, журналіста, выхавацеля моладзі.*

*50 гадоў — пара жыццёвай сталасці. І мы ад усяго сэрца жадаем, каб Вы, уступіўшы ў другую палавіну свайго веку, засталіся гэткім, які Вы ёсць, — удумлівым вучоным, прынцыповым таварышам, цудоўным чалавекам. Шчасця Вам, Міхаіл Яўгенавіч, творчых поспехаў і доўгіх гадоў жыцця!»*

Прыгожыя кветкі і падарункі не парушылі традыцыі, але вось калі юбіляр запрасіў усіх на наступны дзень на абарону сваёй доктарскай дысертацыі, — гэта было ўспрынята ужо як падарунак прысутным, ды і не толькі ім. А ў наступны дзень вядомыя вучоныя Беларусі, Масквы, Украіны адзначылі вялікую каштоўнасць прадстаўленага да абароны даследавання «Стылістыка публіцыстычных жанраў», падкрэслілі актуальнасць і практычную вартасць работы, непаўторны публіцыстычны талент яе аўтара.

І вынік заканамерны. Рашэнне аб прысваенні Міхаілу Яўгенавічу Цікоцкаму ступені доктара філалагічных навук прынята аднагалосна.

**А. АЛЕНІЧ.**



**НА ЗДЫМКУ:** віншуе юбіляра прафесар Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі У. А. Рубан.

Фота **Д. Чаховіча.**

## СА СВЯТАМ!

Савецкія Узброеныя Сілы разам з усімі народамі СССР адзначылі сваю 54-ю гадавіну. Прынялі ўдзел у свяце і студэнты нашага універсітэта. На кожным факультэце прайшлі урачыстыя вечары, сустрэчы з ветэранамі вайны, было прачытана шмат лекцый і дакладаў, праведзены гутаркі. Агітбрыгады многіх факультэтаў выязджалі з канцэртамі ў падшэфныя воінскія часці.

Студэнты шчыра віншавалі сваіх выкладчыкаў, тых, хто ў цяжкія гады выпрабаванняў стаў на абарону Радзімы. Вось адно з віншавальных пісьмаў, дасланых у гэтыя дні да нас у рэдакцыю.

Прапануючы яго ўвазе нашых чытачоў, мы таксама далучаемся да віншавання і жадаем усім выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, здароўя і вялікіх творчых поспехаў.

*«23 лютага наш народ адзначае 54-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Нам, студэнтам другога курса беларускага аддзялення філфака, хочацца павіншаваць з гэтым святам свайго куратара — Леаніда Антонавіча Царанкова, пажадаць яму поспехаў у працы, добрага здароўя, шчасця ў асабістым жыцці.*

*Леанід Антонавіч — куратар нашай групы ужо другі год. За гэты час з яго дапамогай мы правялі некалькі цікавых сустрэч з пісьменнікамі Беларусі, культпаходаў у тэатры і кінатэатры.*

*Леанід Антонавіч — былы воін. Скончыўшы ў г. Сызрані кароткатэрміновыя курсы падрыхтоўкі каманднага саставу, ён быў залічан у артылерыйскую часць. Яго ваенны лёс пачаўся ў самыя цяжкія дні для нашай Радзімы, пад Сталінградам. Тут у 1942 годзе ён уступіў у партыю. Пасля разгрому варожай групіроўкі пад Сталінградам Леанід Антонавіч удзельнічаў у баях за вызваленне г. Растова, паўднёвай Украіны, Малдавіі, затым — Румынія, Балгарыя, Югаславія, Венгрыя, Аўстрыя. Быў два разы паранены. Узнагароджан ордэнам «Чырвонай Зоркі» і іншымі узнагародамі.*

*СТУДЭНТЫ-ВЯЧЭРНІКІ II КУРСА БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА».*

# СОВЕТСКИЙ ЭТИКЕТ

*Недавно Ленинградская организация общества «Знание» РСФСР выпустила в свет сборник «Советский этикет», рассчитанный на самую широкую аудиторию. В него вошли статьи: «Мораль и этикет», «Из истории русского этикета», «Вкус, стиль, этикет», «Служебный этикет», «Власть над собой» и др.*

*Сегодня мы предлагаем вниманию наших читателей в сокращении одну из статей сборника. Надеемся, что этот материал будет использован кураторами групп в проведении воспитательной работы со студентами.*

## МОРАЛЬ И ЭТИКЕТ

Хотя слова — советский этикет — стали употребляться сравнительно недавно, нормы которые он предполагает, возникли не вдруг, они складывались постепенно в результате отбора из правил поведения, существовавших в старом обществе и присущих главным образом трудящимся. Вместе с тем следует иметь в виду, что в правилах этикета, если они разумны, общечеловеческие представления о должном поведении отражаются больше, чем в политических, правовых, нравственных воззрениях и нормах.

Многие и сейчас нередко не замечают, какую роль в нашей жизни играют внешние формы общения между людьми. А представим себе на минуту, что их не было бы. Очевидно, в этом случае сплошь и рядом складывались бы ситуации, напоминающие общение людей, принадлежащих к различным, никак не связанным между собой цивилизациям. И хотя мы не всегда задумываемся над этим, но сразу чувствуем значение внешних форм поведения, как только по какой-либо причине эти сложившиеся и устоявшиеся формы разрушаются. Речь идет о способах приветствий, о допустимых и недопустимых словесных выражениях, о поведении в общественных местах — в театре и музее, в магазине и ателье, на городском транспорте и в поезде. Психологами замечено, что упорядоченность общественной жизни, проявляющаяся в определенных внешних формах взаимоотношений между людьми, есть весьма важное условие ее непрерывности и «спокойного» течения, то есть отсутствия эксцессов, ссор, скандалов. Именно наличие этих форм позволяет каждому человеку правильно представить себе, как окружающие будут реагировать на тот или иной его поступок, и таким образом сообразовывать свое поведение с поведением других людей. Шофер машины, проезжающей по центральной улице, знает, что машина, выезжающая из бокового проезда, уступит дорогу, ибо в соответствии с правилами уличного движения ему принадлежит преимущественное право проезда. Нетрудно понять, как облегчает это и подобные правила, известные каждому водителю, движение транспорта. То же можно сказать и о правилах, регулирующих человеческое поведение. Пожилой или больной человек, вынужденный рассчитывать свои силы, направляясь в другой конец города, знает, что ему должны уступить переднее место в трамвае или троллейбусе, в ином случае он, может быть, и не отправился бы в путь. Разыскивающий какой-либо адрес в чужом городе человек смело отправляется в путь, полагаясь на любезность незнакомых людей, которые помогут ему найти нужную улицу. Обращаясь к тому или иному должностному лицу, человек должен быть уверен, что его внимательно, не перебивая грубым окриком, выслушают, чтобы понять суть дела и т. д.

Внимание, которое за последнее время проявляется к проблемам культуры поведения в нашем обществе, —следствие культурной революции, совершенной в нашей стране за годы Советской власти. Как все достижения в развитии культуры, успешное внедрение правил советского этикета зависит от достижений в экономике, от роста благосостояния советского общества. Но было бы неправильным делать из этого вывод о том, что культура каждой семьи или каждого человека должна прямо определяться их достатком. Такой вывод лишь помог бы некоторым людям оправдать свое нежелание выработать навыки культуры поведения ссылками на нерешенные для них экономические проблемы. Ведь такие ссылки были бы обоснованными лишь в том случае, если бы правила советского этикета требовали, например, для сервировки стола, для выхода в гости, в театр, для приема друзей того, что не каждому доступно. Однако в отличие от правил, которые складывались в старом обществе, советский этикет отличается ярко выраженным демократизмом. Разумность, простота, естественность, максимальное уважение к человеку труда, уважение достоинства личности, отношение к человеку, не имеющее ничего общего с чинопочитанием, с делением людей по их рангам, — вот на чем зиждется советский этикет. Воспринимая из веками складывавшихся правил поведения все самое демократичное и целесообразное, наш этикет вместе с тем принципиально не приемлет того, что хоть в какой-то степени может привести к унижению человеческого достоинства.

Одним из замечательных источников подлинной культуры общения является ленинский стиль взаимоотношений и поведения. При этом следует обратить внимание на то, что деликатность, любезность, простота и ясность в личных и общественных отношениях не мешали В. И. Ленину — политику, как это подчеркивали его соратники, быть сосредоточенным, чуждым сентиментов и, в случае необходимости, суровым в борьбе с врагами рабочего класса.

Ленинские высказывания о принципах коммунистической морали, о культуре взаимоотношений между людьми, содержащиеся в статьях, письмах, записках, в беседах Владимира Ильича, позволяют сформулировать важнейшие требования, которые мы предъявляем к советскому этикету.

Нравственной основой советского этикета являются гуманизм и коллективизм. Речь идет о социалистическом гуманизме. Не абстрактная и созерцательная любовь к человеку, не одни лишь воздыхания о его невзгодах и страданиях, пронизывающие гуманистические концепции, распространенные на Западе, а решительная борьба с социальным злом в любых его проявлениях, возможная только на классовой основе, активное стремление ликвидировать все, что мешает счастью человека труда, — вот что собой представляет социалистический гуманизм. Именно на такой основе мы и строим нашу культуру взаимоотношений, заботясь о том, чтобы уважение к человеческому достоинству и забота о личности не превращались в поощрение тех, кто нарушает нормы социалистического общежития не только в большом, но и в малом, в тех «пустяках», к которым мы порой слишком снисходительны. «Человека нужно не лепить, а ковать», — говорил А. С. Макаренко, подчеркивая отрицательное отношение нашей морали к ханжескому умилению перед споткнувшимися людьми. Ведь и сейчас не редки случаи, когда нарушитель общепринятых норм поведения встречает сочувствие некоторых «гуманистов», забывающих о том ущербе, который нарушители приносят чести и достоинству других людей. Пожалеть пьяного или трезвого хулигана — это значит не жалеть, не любить по-настоящему тех, кому он отравляет жизнь. Правила культуры взаимоотношений советских людей пронизывает подлинный гуманизм, органически сливающийся с коллективизмом нашего общества, но не всеядная любовь ко всем и не христианское всепрощение.

Коллективизм, как нравственная основа советского этикета означает умение в самых повседневных поступках видеть грани, за которыми начинается противопоставление личности обществу, коллективу.

Принципы гуманизма и коллективизма воплощены в ряде моральных требований, непосредственно отражающихся в культуре взаимоотношений. Следует прежде всего назвать вежливость, тактичность, скромность и точность.

Вежливость — форма взаимоотношений с окружающими людьми, как знакомыми и близкими, так и с незнакомыми, с которыми мы встречаемся в жизни на минуты и больше никогда не встретимся. Суть вежливости — доброжелательство. Встречая человека, мы говорим ему «Доброе утро», «Добрый день», «Добрый вечер». Прощаясь, мы говорим «До свидания», тем самым как бы предполагая встретиться еще раз. Обращаясь к человеку с пустяковой просьбой, мы употребляем выражение «Будьте добры...» Понятие добра органически входит в целый ряд общепринятых формул вежливости. Этим самым обнаруживается связь подлинной вежливости с гуманизмом в том социальном смысле, который мы придаем этому понятию.

Разумеется, в жизни возникают ситуации, когда мы вынуждены иметь дело с человеком, не заслуживающим по тем или иным причинам уважения. Но это не означает, что можно унижать его человеческое достоинство. В данном случае он воспримет такое отношение только как личную неприязнь, никак не вызванную его действиями.

Сродни вежливости понятие корректности, которое имеет особый оттенок, заключающийся в умении держать себя в рамках общепринятых приличий в любых ситуациях. Разумеется, при любых правилах этикета поведение человека в значительной мере зависит от состояния его нервной системы, от характера, темперамента. Проявить корректность — значит сохранить достоинство, не опуститься до уровня того распущенного обывателя, о котором писал К. Маркс: «Грубый, невоспитанный человек готов считать того или иного прохожего самой скверной и самой низкой тварью на земле только потому, что тот наступил ему на мозоль. Свои мозоли он делает мерилом оценки человеческих действий».

Требования корректности во взаимоотношениях отвечают интересам всех. При соблюдении этих требований в споре можно быстрее найти истину. В служебных отношениях корректность помогает устранить то, что мешает интересам дела, создавая ненужную напряженность, в личных отношениях она способствует тому, чтобы люди лучше понимали друг друга

Тактичность — это чувство меры, которое необходимо соблюдать в разговоре, в личных и служебных отношениях, умение чувствовать границу, за которой в результате наших слов или действий начинается незаслуженная обида у человека, с которым мы говорим. Иногда совершенно правильное по существу замечание в адрес другого мы, не задумываясь, облекаем в обидную форму, которая отвлекает его внимание от содержания высказывания.

Тактичность требует всестороннего учета всех обстоятельств, в том числе и такого немаловажного, как своеобразие личности человека при общении с ним.

Тактичность включает в себя умение не заметить какую-либо оплошность другого человека. Тактичный человек не задаст вопроса, который поставит собеседника в неловкое положение. Навязчивость, назойливость, даже если они вызваны самыми лучшими побуждениями, например, желанием оказать услугу, помочь, вызывают отрицательную реакцию. Чувство меры, позволяющее проявить уважение к достоинству другого человека и вместе с тем обнаружить собственное достоинство, — вот к чему сводится тактичность.

Скромность — неотъемлемая черта культуры взаимоотношений. Скромный человек никогда не считает себя личностью выдающейся, не кокетничает какими-либо своими достоинствами. Он не отказывается от самооценки, но всегда сопоставляет ее с мнением окружающих людей. Скромность в нашем представлении не означает самоуничижения, отказа от гордости, независимости, самостоятельности в поведении. Она выражает подлинное уважение к человеку труда, к людям социалистического общества. Скромность человека обнаруживается в его умении быть самим собой и не играть какой-либо не свойственной ему роли. Скромность означает безыскусственность поведения, отсутствие театральности, позерства. Вместе с тем подлинная скромность не должна быть источником скованности в поведении, порождаемой нередко опасением: как бы мой поступок, движение, слова не оценили как нескромные.

Наш советский этикет решительно осуждает любое проявление развязности, пошлости. У нас нетерпимо поведение, свидетельствующее о том, что человек думает только о самом себе, любуется собой, не замечает, как окружающие реагируют на его поступки. Но вместе с тем чувство собственного достоинства, умение в разговоре, в манерах показать, что вы никому не позволите поставить себя в нравственном отношении ниже других, органически соединяется с подлинной скромностью.

В единстве со скромностью находится простота — качество, которое отнюдь не связано с отказом от принятых в обществе норм этикета. Позволить себе фамильярность по отношению к незнакомому или односторонне перейти «на короткую ногу» с человеком, который занимает подчиненное положение, — это не значит проявить простоту во взаимоотношениях.

Наконец, одним из важнейших требований культуры взаимоотношений, вытекающим из принципов коммунистической морали, является точность. А. С. Макаренко говорил: «Точность в нашей жизни — это моральная норма, это великое дело в борьбе за наше богатство». Такой смысл точности особенно обнаруживается в деловых, служебных отношениях, в общественной жизни, где человек своей неточностью может подвести целый коллектив, сорвать выполнение важного задания, нарушить ритм производственной работы.

Точность означает прежде всего умение ценить свое слово, не бросать его на ветер. Если человек всегда выполняет то, что обещает, если он приходит в то время, которое назначено или о котором существует с ним договоренность, значит, на него можно положиться. Следуя требованиям точности, человек обычно подтянут, собран, и это сказывается в его движениях, манере держать себя, во всем его облике. Точное выражение своих мыслей, умение без лишних слов выразить то или иное положение, чтобы не было двусмысленных фраз, — также важное требование культуры взаимоотношений.

Таковы основные правила советского этикета. Воспитывая в себе и в окружающих уважение к советскому этикету, мы должны учитывать, что истинная культура поведения обнаруживается не тогда, когда человек, хотя и следует отдельной норме этикета, но игнорирует принципы коммунистической морали. Иные люди знают правила этикета, обладают изысканными манерами, начитаны, имеют разносторонние знания. Но если они нарушают нравственные нормы нашей жизни, их нельзя назвать культурными, их «этикет» фальшив. Истинная культура — там, где поступки человека, их содержание и внешняя сторона органически соответствуют нравственным принципам нашего советского общества.

---

**Партия считает, что МОРАЛЬНЫЙ КОДЕКС СТРОИТЕЛЯ КОММУНИЗМА включает такие нравственные принципы:**

**— преданность делу коммунизма, любовь к социалистической Родине, к странам социализма;**

**— добросовестный труд на благо общества: кто не работает, тот не ест;**

**— забота каждого о сохранении и умножении общественного достояния;**

**— высокое сознание общественного долга, нетерпимость к нарушениям общественных интересов;**

**— коллективизм и товарищеская взаимопомощь: каждый за всех, все за одного;**

**— гуманные отношения и взаимное уважение между людьми: человек человеку — друг, товарищ и брат;**

**— честность и правдивость, нравственная чистота, простота и скромность в общественной и личной жизни;**

**— взаимное уважение в семье, забота о воспитании детей;**

**— непримиримость к несправедливости, тунеядству, нечестности, карьеризму, стяжательству;**

**— дружба и братство всех народов СССР, нетерпимость к национальной и расовой неприязни;**

**— непримиримость к врагам коммунизма, дела мира и свободы народов;**

**— братская солидарность с трудящимися всех стран, со всеми народами.**

# ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

У сваім звароце да VII Усесаюзнага з'езда ДТСААФ Цэнтральны Камітэт КПСС, выказау цвёрдую упэўненасць у тым, што арганізацыі ДТСААФ будуць і надалей яшчэ з большай энергіяй удасканальваць абаронна-масавую работу у калектывах працоуных і навучэнцау, развіваць ваенна-тэхнічныя віды спорту, павышаць якасць падрыхтоукі спецыялістау для арміі і народнай гаспадаркі, актыуна удзельнічаць у выхаванні савецкіх людзей у духу высокай пільнасці, пастаяннай гатоунасці да абароны сацыялістычнай Айчыны. Прадметам асаблівых клопатау ДТСААФ як надзейнага памочніка і рэзерва Узброеных Сіл і у далейшым павінна быць падрыхтоўка моладзі да ваеннай службы.

Арганізацыя ДТСААФ універсітэта, выконваючы рашэнні сёмага з'езда ДТСААФ СССР, уступіла у сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы 50-годдзя утварэння СССР. Асабліва вялікая абаронна-масавая работа праводзіцца у перыяд месячніка абаронна-масавай работы, які праводзіцца у гонар 54-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. На факультэтах праходзяць сустрэчы студэнтау з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, Героямі Савецкага Саюза, урачыстыя сходы і вечары, прысвечаныя гадавіне нашай арміі. Аб размаху гэтай работы гавораць такія факты: у кінафестывалі ваенна-патрыятычных фільмау прынялі удзел каля 7000 чалавек; у адзін з перадсвяточных дзён толькі на хімічным факультэце перад студэнтамі выступілі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Л. Н. Арцемянкоу, Ф. Ф. Церашонак, Герой Савецкага Саюза Вайнруб.

У перыяд месячніка праводзіліся спаборніцтвы па кулявой стральбе на першынство курсау і факультэтау, а з 21 лютага пачаліся спаборніцтвы па кулявой стральбе на першынство універсітэта. У перыяд месячніка заканчвае работу гурток па падрыхтоуцы парашутыстау. 25 студэнтау гатовы да прыжкоу з парашутам, але неспрыяльнае надвор'е пакуль перашкаджае падвесці вынікі. Завяршае праграму навучання чарговы набор у гуртку па падрыхтоуцы шафёрау-аматарау. Правы на ваджэнне аутамабіля атрымалі тт. Комяк, Крукоуская, Ангалевіч, Шолух і іншыя. Камітэт ДТСААФ універсітэта прыступіу да фарміравання новых кантынгентау парашутнага і аутамабільнага гурткоу.

Добра выступіла на спаборніцтвах па радыёспорту на першынство г. Мінска каманда універсітэта у саставе Кахновіч, Касценка, Гуляшова, Фінагенавай, Крэміс, Чарвякова.

Да 54-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту большасць арганізацый ДТСААФ факультэтау датэрмінова закончылі збор членскіх узносау, распаусюдзілі латарэйныя білеты. Лепшымі па збору членскіх узносау з'яуляюцца арганізацыі ДТСААФ біялагічнага (старшыня т. Фядосау) і геаграфічнага (старшыня т. Галай) факультэтау.

Месячнік абаронна-масавай работы, прысвечаны 54-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, падыходзіць к канцу. У бліжэйшыя дні будуць падведзены вынікі работы факультэцкіх арганізацый ДТСААФ.

**М. ГАРЛАТАЎ,**
старшыня **ДТСААФ БДУ.**

# ВЯЛІКІ ЮБІЛЕЙ

24 ЛЮТАГА спауняецца 80 год вядомаму савецкаму пісьменніку Канстанціну Аляксандравічу Федзіну. Увесь яго слауны шлях адзначан актыуным удзелам у жыцці народа, што прадвызначыла вартасць кожнага яго твора, так як, па словах пісьменніка, «велічнасць літаратуры вымяраецца тым, як глыбока пранікае яна у сэрца народа».

Адзін з пачынальнікау савецкай літаратуры, К. А. Федзін прайшоу шлях, тыповы для прадстаунікоу яе старэйшага пакалення: ён быу удзельнікам грамадзянскай вайны, служыу у газеце 7-й арміі «Баявая праўда» і, падобна Фурманаву, Серафімовічу, Фадзееву, Ус. Іванову адкрыу «навігацыю вялікай савецкай літаратуры».

Ужо у пачатку літаратурнай дзейнасці пашчаслівілася адчуць на сабе мудрае настауніцтва А. М. Горкага. Факт знаёмства з Горкім «зрабіуся вялікай падзеяй маёй пісьменніцкай біяграфіі». Горкі дапамог пісьменніку набыць свой голас, зразумець сутнасць ваяунічага гуманізму, «вызваліцца ад «серапіонаускай коры».

З самага пачатку галоунай тэмай творчасці К. Федзіна стала тэма рэвалюцыі, канфліктам — барацьба двух лагерау, героямі — камуністы, рэвалюцыянеры, прынёсшыя у жыццё дух творчай актыунасці. Праз усе раманы — «Гарады і гады», «Браты», «Украданне Еуропы», «Санаторый «Арктур», аж да трылогіі «Першыя радасці», «Незвычайнае лета» і «Касцёр» праходзіць ідэя непазбежнасці і заканамернасці перамогі рэвалюцыі.

Гістарызм у выбары і апрацоуцы матэрыялу дапамагае пісьменніку стварыць «вобраз часу» (па яго словах), а раманы, і перш за усё трылогія, заслугоуваюць назвы эпічных. Трылогія Федзіна можа быць аднесена па свайму жанру і значэнню у развіцці савецкай літаратуры да такіх творау, як «Жыццё Кліма Самгіна», «Ціхі Дон», «Блуканне па пакутах», «Рускі лес».

Па выбару матэрыялу, аднак, яна бліжэй усіх да талстоускай эпапеі, таму што паказвае у асноуным лёс інтэлігенцыі. Пры гэтым Федзін выбірае найбольш блізкі яму аспект гэтай тэмы: адносіны творчай інтэлігенцыі да рэвалюцыі, або яшчэ вужэй, месца і роля мастацтва у сацыяльным жыцці.

Ад рамана да рамана выкрышталізоувалася, паглыблялася гэта праблема, але ужо з пачатку яна паўставала у форме вываду: мастацтва бяссільна, калі яно адарвана ад палітыкі і барацьбы за перадавыя ідэалы; мастак набывае сілу толькі у служэнні рэвалюцыйнаму народу.

Вялікай заслугай пісьменніка было стварэнне ім героя нашай эпохі. У трылогіі К. Федзіну ўдалося ў выніку шматгадовых пошукау і працы стварыць тыповы партрэт камуніста, вобраз правафлангавага нашай літаратуры, П. Рагозіна і К. Ізвекава, увайшоушага у залаты фонд савецкага мастацтва.

У завяршаючым трылогію рамане «Касцёр» адлюстроуваюцца падзеі 1941 года. Брэст, ахоплены пажарам вайны. Цікава, што задума усёй эпапеі узнікла у 1936 годзе у сувязі з наведаннем Беларусі, а тэма будучага рамана асацыіравалася з успамінамі аб наведанні Мінска, на фоне якога ужо тады скрозь магічны крышталь таленту Федзін бачыў сваіх герояу, якіх ён называе «звычайнымі людзьмі нашага незвычайнага часу».

60 год ужо працуе пісьменнік у літаратуры і да гэтага часу застаецца у першых яе радах як відны рэаліст, сапраудны майстар мастацкага слова, вялікі аутарытэт, які служачы прыкладам маладым пісьменнікам, спалучае сваю літаратурна-творчую дзейнасць з вялікай грамадска-палітычнай работай. Старшыня праўлення Саюза Савецкіх пісьменнікау, Герой Сацыялістычнай Працы, відны дзеяч барацьбы за мір, К. Федзін застаецца у той жа час публіцыстам у лепшым сэнсе гэтага слова. Яго артыкулы нязменна пранікнуты патрыятычным пачуццём і верай у перамогу прагрэсіўных дэмакратычных сіл свету.

**Н. РАМАШКА,**
**дацэнт.**

# ПАЛАЖЭННЕ

## *АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ*

### I. МЭТА АГЛЯДУ:

Далейшае развіццё мастацкай самадзейнасці, прыцягненне новых сіл у рады удзельнікау, павышэнне ідэйна-мастацкага узроуню самадзейнасці, распаусюджанне вопыту работы лепшых самадзейных калектывау.

### II. КІРАЎНІЦТВА

Арганізатарамі агляду мастацкай самадзейнасці з'яуляюцца: рэктарат, партком, камітэт камсамола, мясцком, прафком і прауленне клуба універсітэта.

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіць арганізацыйны камітэт у наступным саставе:
ЛЫСЕНКА С. А. (старшыня аргкамітэта);
ДЗЕДУШКІН А. Н.;
ФЯДОТАЎ А. А.;
АКСЯНЕВІЧ Н. П.;
ЗІНЕВІЧ З. І.; (члены аргкамітэта).

### III. ЖУРЫ

Журы агляду састауляюць кіраунікі народных калектывау мастацкай самадзейнасці універсітэта, а таксама прадстаунікі арганізатарау агляду. Састау журы—15 чалавек. Журы агляду вызначае тры першых месцы. Два аднолькавыя месцы не прысуджаюцца. Месцы вызначаюцца тайным галасаваннем.

Журы вызначае лепшы калектыу: 1) па прадстауніцтву ва універсітэцкай мастацкай самадзейнасці; 2) па выканаўчаму майстэрству; 3) па масавасці; 4) па колькасці выездау агітбрыгады.

Ацэньваючы мастацкі узровень выканання, журы звяртае увагу і на сцэнічную культуру удзельнікау агляду

Рашэнне журы афіцыйна аб'яуляецца на заключным канцэрце 15 красавіка 1972 года.

### IV. МЕСЦА І ЧАС ПРАВЯДЗЕННЯ

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца у актавай зале галоунага корпуса у наступныя

| тэрміны: | ФАКУЛЬТЭТЫ | ЧАС |
|---|---|---|
| 6 красавіка— | гістарычны | (18.00—19.30) |
| | біялагічны | (19.30—21.00) |
| 7 красавіка— | матэматычны | (18.00—19.30) |
| | філалагічны | (19.30—21.00) |
| 8 красавіка— | геаграфічны | (18.00—19.30) |
| | журналістыкі | (19.30—21.00) |
| 9 красавіка— | хімічны | (10.00—11.30) |
| | фізічны | (11.30—13.00) |
| | прыкладной матэматыкі | (13.00—14.30) |
| | юрыдычны | (14.30—16.00). |

### V. УМОВЫ АГЛЯДУ

У аглядзе прымаюць удзел калектывы мастацкай самадзейнасці факультэтау універсітэта.

Факультэту прадастауляецца права правесці рэпетыцыю у зале агляду непасрэдна перад пачаткам агляду, працягласцю не больш 2-х гадзін.

У час агляду факультэты паказваюць паутарагадзінную праграму. У ёй павінны быць:
1) творы тэматычнага характару;
2) творы беларускіх аутарау;
3) арыгінальны жанр (пантамімы, мініатуры і г. д.).

### VI. УЗНАГАРОДЖАННЕ

Калектыу мастацкай самадзейнасці факультэта, які заняу першае месца, узнагароджваецца пераходным сцягам, ганаровай граматай і грашовай прэміяй.

Калектывы, заняушыя II і III месцы, узнагароджваюцца ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі. Лепшыя выканауцы заахвочваюцца прызамі. Узнагароджваюцца удзельнікі агляду з ліку выкладчыкау.

Узнагароджанне пераможцау —на заключным канцэрце 15 красавіка 1972 года.



У навукова-даследчай лабараторыі арганічнай хіміі студэнткі-дыпломніцы хімфака Алена **Падколзіна** і Тамара **Мардас**. Фота **Д. Чаховіча.**

## ПА СТАРОНКАХ НАВУКОВАЙ ПЕРЫЁДЫКІ

### *ЗАМЯНІЦЕЛЬ ШКЛА*

**Поліэтылен, атрыманы пад вялікім ціскам, празрысты, але мяккі і не валодае цеплаcтойкасцю, а поліэтылен, атрыманы пры нізкім ціску, жаpастойкі, але не празрысты. Як паведамляе японская газета «Майніці», вучоныя універсітэта Кіота падверглі ліставы поліэтылен апраменьванню рэнтгенаускімі і гама-промнямі, пракаталі да адной дзесятай яго першапачатковай таушчыні і атрымалі цёпластойкі (пункт плаўлення — 150 градусау), трывалы і празрысты матэрыял, які можа паспяхова замяняць шкло.**

### *НЕЗВЫЧАЙНЫ КВАЗАР*

**Астраномы абсерваторыі у Новым Паўднёвым Уэльсе (Аустралія) з дапамогай радыётэлескопа выявілі на адлегласці некалькіх мільёнау светавых год ад Зямлі квазер, які валодае незвычайнымі уласцівасцямі. Квазер быу першапачаткова выяулен чатыры месяцы таму назад. Яго яркасць няспынна павялічваецца і у цяперашні час перавысіла межы, якія раней былі вядомы для квазерaў. Мяркуецца, што калі у далейшым яркасць квазера будзе павялічвацца, то наступіць момант, калі яго можна будзе ўбачыць няузброеным вокам.**





**На здымках:** лекцыю па марксісцка-ленінскай сацыялогіі для студэнтаў трэцяга курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта чытае прафесар **Г. П. Давідзюк.**

Фота **Д. Чаховіча.**



*Другі семестр уступіў у свае правы. Зноў прыкавалі студэнцкую ўвагу бібліятэкі, чытальныя залы, кабінеты.*

*Час імчыць хутка, а справу ў кожнага—нават цяжка пералічыць — лабараторныя і курсавыя, семінарскія і дыпломныя працы патрабуюць штодзённых настойлівых заняткаў.*

# ЛЫЖНЯ ВЯДЗЕ НА ШВАКШТЫ

ДЗЕНЬ выдаўся на славу—сонечны, марозны. Мы ішлі па снежным пакрывале возера міма застыўшых над лункамі рыбакоў, аглядваючыся раз-пораз на адплываючы з кожнай мінутай бераг і лес, з якога выбегла наша лыжня. Уперадзе, за віднеючым на гарызонце краем леса, праходзіць шаша. Праз некаторы час мы да яе выйдзем. Наш паход закончыўся. Мы моцна звяжам лыжы, здымем «пахудзеўшыя» за восем дзён рукзакі і сядзем у аўтобус, які па прамерзлых дарогах паімчыць нас у Мінск. Пад вечар мы зноў будзем любавацца захадам сонца, але цяпер, з акна аўтобуса, ён будзе здавацца не такім, як учора, і нават самыя вясёлыя песні будуць здавацца не такімі вясёлымі. У думках час ад часу мы будзем зноў пераносіцца назад, да тых цудоўна прайшоўшых васьмі дзён, успамінаючы кожны з іх асобна

**Дзень першы.** Не ведаю, як для каго, а для мяне і маіх сяброў дарога заўсёды пачынаецца з песні. І калі вы часам пачуеце ўранні на пероне вакзала:

«Мы уезжаем.
До свиданья, город.
Колесам долго стыки
рельс толочь...»—

дык ведайце: гэта чарговая група турыстаў адпраўляецца ў дарогу.

Для нас, членаў клуба турыстаў-а л ь п іністаў БДУ, гэта ўжо стала прывычным: адразу пасля сесіі ісці ў паход. Вось і цяпер некалькі груп ідуць па розных маршрутах на поўнач Беларусі, у раён возера Швакшты, дзе павінна адбыцца зімовая справаздача турыстаў універсітэта.

**Дзень другі.** Сёння ідзе снег, мяцеліць. Гэта добра, калі ўлічыць, што ўчора нашы лыжы, так і шоргалі па голай зямлі. У канцы дня, добра выматаўшыся, прыходзім у Смаргонь. Тут мы сустракаем яшчэ дзве свае групы. Вечар праводзім разам.

**Дзень трэці.** Снег усё ідзе. Лес—проста казка. Выходзім да ракі Віліі. Вечарам размяшчаемся на халодную начоўку. У групе нямала навічкоў, і для іх гэта першае сур'ёзнае выпрабаванне. Пад раніцу паваліў мокры снег і засыпаў палаткі, у выніку сёй-той у іх прамок. Днём надвор'е рэзка змянілася: пахаладала, узмацнеў вецер. Ісці стала цяжэй. Рухаліся не вельмі хутка: намяло за ноч. Час ад часу спыняемся, і Жэня Ціткін, кіраўнік групы звярае свой «азімут». Вечарам дакладна выйшлі да вёскі Вішнёва. Начуем у школе-інтэрнаце. Увесь вечар тым і займаліся, што сушылі спальныя мяшкі. Цяпло і стомленасць вяршаць сваю справу—сон прыходзіць імгненна.

**Дзень чацвёрты.** Пераход праз Вішнёўскае возера. Надвор'е выдатнае, вось толькі вецер. Вечарам, седзячы у вялікай халоднай хаце, саграваліся песнямі.

**Дзень пяты.** Прыйшлі ў вёску Засвір. Пакуль бегалі па хатах у пошуку «кухні», падыйшла група Уладзіміра Сіроціна. Натуральна, воклічы радасці, абдымкі. Цяпер шукаем «кухню» разам. Веска Засвір уяўляе нямалую цікавасць для турыстаў і проста для аматараў старыны.

**Дзень шосты—восьмы.** Сёння ў нашага заўгаса Алега Ачасава дзень нараджэння. Ва ўрачыстых абставінах яму былі ўручаны каштоўныя падарункі — сушаная вобла і банка варэння.

Падыйшла група супрацоўніка універсітэта Аляксандра Люцко. Цяпер ужо ўсе разам у дарогу на Швакшты. Надвор'е проста цудоўнае. Днём—амаль як у Пушкіна—«Мороз и солнце— день чудесный», а вечарам—прывабныя сваёй прыгажосцю захады.

На беразе возера, у ляску, разбілі мы свой лагер. Да вечара сёмага дня сталі падыходзіць іншыя групы. Намячаліся цікавыя падзеі. Старэйшыя на чале з Сашай Люцко доўга бегалі па лагеры, аб нечым шушукаліся, часам са зларадасцю паглядваючы на тых, для каго гэты паход быў першым. Затым альпіністы-разраднікі пабеглі ў лес і доўга лазілі па дрэвах, узводзячы традыцыйную паласу перашкод, напалавіну турысцкую, напалавіну альпінісцкую.

А вечарам да нас прыйшоў госць. Госця звалі Рымас Відлута. Ён турыст, студэнт Вільнюскага універсітэта. Прыбыў па запрашэнню, якое мы пасылалі літоўскім турыстам. На жаль, толькі адзін.

Вечарам — адкрыццё злёту. Кіраўнікі сямі прыйшоўшых на злёт груп здаюць рапарты. Многае зроблена за час паходу. Прачытаны лекцыі, праведзены сустрэчы з вучнямі мясцовых школ, з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.

Гучыць нязменны турысцкі гімн — «Глобус». Паволі па флагштоку падымаецца флаг злёту. У руках у рабят факелы. Іх полымя асвятляе радасныя твары, лес, прыціхшы, нібы ад здзіўлення, і пакрытыя серабром інею палаткі. Пасля яшчэ доўга сядзелі рабяты ля кастра. Расказвалі аб мінулых паходах, успаміналі тых, хто быў яшчэ ў дарозе (універсітэцкія ж турысты адправіліся і на Кольскі паўвостраў, у Карпаты, на Урал), і, вядома, увесь вечар звінела гітара і разам з ёю песня.

А калі ўсе песні былі праспяваны, выпіты увесь чай, рабяты разбегліся па палатках. Мароз быў вельмі моцны і раніцай, унутры і зверху палаткі былі пакрыты замаразззю. Затое днём амаль усім было горача. Праграма апошняга дня аказалася даволі цікавай. Стала зразумела, аб чым шушукаліся ўчора старэйшыя. Навічкоў сёння «хрысцілі» у турысты. Рабілі гэта старым, выпрабаваным спосабам, шумна і весела. Затым усе паказалі сваё уменне пераадольваць паласу перашкод. Пераможцаў чакалі ўзнагароды...

Недзе ў сярэдзіне дня мы адправіліся ў дарогу. Апошні пераход. Там, на супрацьлеглым беразе возера, за лесам праходзіць шаша. Праз нейкі час мы да яе выйдзем...

**Г. КІСЯЛЁЎ,**
**студэнт III курса філфака.**

## У НАШЫХ АРТЫСТАЎ

*У сакавіку гэтага года народны аркестр народных інструментаў святкуе сваё 25-годдзе. Зараз аркестр рыхтуе новую праграму, з якой выступіць па беларускаму тэлебачанню. У справаздачным канцэрце прымуць удзел вядучыя салісты опернага тэатра.*

*Некалькі дзён назад у калектыў прыйшла радасная вестка: за заслугі ў развіцці культуры і народнай творчасці мастацкаму кіраўніку і дырыжору аркестра М. А. Лісіцыну Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.*

*ЧЫМ ЖЫВЕ СТУДЭНЦКІ КЛУБ*

*Багатая і разнастайная праграма работы клуба на другі семестр гэтага навучальнага года. Толькі што закончыўся фестываль ваенна-патрыятычных фільмаў, дадзен канцэрт на вечары для супрацоўнікаў універсітэта.*

*З 6 красавіка пачынаецца агляд мастацкай самадзейнасці, а яшчэ раней, у сакавіку, адбудзецца вялікі канцэрт для каманднага саставу БВА. У гонар 50-годдзя утварэння Саюза ССР вырашана абмяняцца канцэртамі з Адэскім універсітэтам. У канцэрце прымуць удзел усе народныя калектывы БДУ.*

*НАШ КАР.*

# БУДЗЬ ДОНАРАМ!

Донар—чалавек, які дорыць жыццё другому чалавеку. Донар—гэта выратавальнік! Без перабольшання мы можам так гаварыць, таму што кроў донараў выратавала жыццё многім людзям.

У нашай краіне пераліванне крыві асабліва шырока прымяняецца пры цяжкіх траўмах, раненнях, апёках, пры рознага роду крывацёках. Нярэдка звяртаюцца да гэтага магутнага цалебнага сродку пры інфекцыйных захворваннях, розных дзіцячых хваробах, пры многіх хваробах крыві, кроватворных органаў і многіх іншых захворваннях. Ні адна цяжкая аперацыя не праводзіцца без пералівання крыві. Яно аказвае добратворны ўплыў пры доўга не зрастаючых пераломах касцей і працягла не зажываючых язвах. З донарскай крыві рыхтуюць гама-глабулін, фібрынаген, фібрыналізін, супрацькоравую сываратку і іншыя даволі каштоўныя прэпараты. Як лячэбны метад пераліванне крыві, а таксама прымяненне яе кампанентаў не мае сабе роўных па шырыні прымянення і сіле ўздзеяння. У нашай краіне са шматмільённым насельніцтвам патрэба ў донарскай крыві надзвычай вялікая. І тыя, хто здае сваю кроў для выратавання людзей, якія маюць патрэбу ў ёй, дастойны самай высокай павагі.

Донарам можа быць кожны практычна здаровы чалавек ва ўзросце ад 18 да 60 год. Перад узяццем крыві донар атрымлівае лёгкае снеданне, а пасля ўзяцця крыві—абед. Адпаведна распараджэнню Савета Міністраў донару, здаўшаму кроў, прадастаўляецца 2 дні адпачынку. Пры жаданні донар можа гэтыя дні далучыць да чарговага водпуску. Яму аплачваецца пры гэтым яго сярэдні заработак.

Студэнтам прадастаўляецца адпачынак па даведцы, выдадзенай паліклінікай універсітэта. Кроў у донара дазваляецца браць з інтэрвалам не менш чым у 8 тыдняў.

Для здаровых людзей з нармальным саставам крыві донарства бясшкодна, гэта даказана шматлікімі навуковымі даследаваннямі. Узяцце ў донара невялікай колькасці крыві нікольні не адбіваецца на яго самаадчуванні і працаздольнасці.

У 1957 годзе па ініцыятыве ленінградцаў і масквічоў у нашай краіне разгарнуўся і ў цяперашні час шырыцца патрыятычны рух за безвыплатную аднаразовую дачу крыві. У некаторых вышэйшых навучальных установах нашай краіны (г. Ленінград і іншыя) кожны трэці студэнт і супрацоўнік з'яўляюцца актыўнымі донарамі. Планавыя заданні ў мінулыя гады па безвыплатнай дачы крыві студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта складалі па 500 донараў, у 1972 годзе — планавае заданне павялічана ўдвая. Для універсітэта выдзелена тры Дні донара: 1 сакавіка, 28 красавіка і 2 лістапада.

У кожны Дзень донара донарскі пункт (паліклініка універсітэта) павінны наведаць не менш 350 донараў. Забор крыві будуць праводзіць дзве брыгады з 10.00 да 16.00 гадзін.

Пярвічная арганізацыя Таварыства Чырвонага Крыжа, камітэт камсамола, прафком і мясцком заклікаюць студэнтаў, супрацоўнікаў і прафесарска-выкладчыцкі састаў БДУ 1 раз у год безвыплатна здаць кроў для лячэбных мэт.

**В. ЦІМАФЕЕЎ,**
**старшыня камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа БДУ.**

# КРОССВОРД



**По горизонтали: 5.** Поэт, который в годы Великой Отечественной войны находился в действующем флоте. **6.** Военачальник, автор книги «Через Гоби и Хинган». **9.** Роман Д. Фурманова. **11.** Автор повести «Сын полка». **12.** Писатель-сатирик, погибший в 1941 году. **15.** Прославленный полководец, автор мемуаров «Воспоминания и размышления». **17.** Немецкий писатель, сражавшийся с фашизмом в Испании. **18.** Разведчик, герой книги А. Тишкова. **19.** Драматург, автор пьесы «Любовь Яровая». **20.** Детский писатель, погибший на фронте в 1941 году. **24.** Вид иллюстрации в книгах на военную тему. **25.** Поэт и писатель, переживший ленинградскую блокаду. **26.** Предварительное сообщение о выходе книги. **29.** Писатель, офицер Панфиловской дивизии. **30.** Герой романа «Живые и мертвые». **31.** Одно из центральных издательств. **33.** Поэма Ю. Марцинкявичюса. **34.** Военачальник, автор книги «В походах и боях».

**По вертикали: 1.** Пьеса В. Биль-Белоцерковского. **2.** Белорусский писатель, автор романа «Минское направление». **3.** Автор романа о комсомольцах-подпольщиках. **4.** Имя главного героя пьесы К. Симонова «Парень из нашего города». **7.** Поэт, павший в боях за Родину. **8.** Роман Н. Бирюкова. **10.** Военачальник, автор книги «Сорок пятый». **13.** Партийная кличка М. В. Фрунзе. **14.** Доктор искусствоведения, автор многотомной «Всеобщей истории искусств». **16.** Писатель и драматург, автор киносценария «Сталинградская битва». **18.** Сборник стихов А. Прокофьева. **21.** Пьеса А. Корнейчука. **22.** Альманах издательства «Молодая гвардия». **23.** Автор романа «Сталь и шлак». **27.** Отрезок времени, когда молчаливо чтят память павших. **28.** Роман О. Гончара. **31.** Молдавский писатель, участник гражданской войны. **32.** Автор романа «Далеко от Москвы».

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 01083

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. Заказ 211.